Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
________________ А. В. Макоўчык
"16" 06 2020 г.
Рэгістрацыйны № УД-03-30-2020/уч.

**САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ КАНФЛІКТЫ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ**
Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура)
для спецыяльнасці: 1-21 80 15 Гісторыя

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі "Вышэйшая адукацыя. Другая ступень (магістратура) па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя", зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.06.2019 № 81

**СКЛАДАЛЬНІК:**
З.І Канапацкая, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ імя М. Танка, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
У.В. Тугай, загадчык цэнтрам усеагульнай гісторыі і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар;
А.А. Корзюк, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ
(пратакол № 10 ад 29.04.2020)

Загадчык кафедры С.А. Талмачова

Навукова-метадычным саветам БДПУ
(пратакол № 5 ад 16. 06. 2020)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст магістратуры В.А.Сергушкіна

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Канфлікты з'яўляюцца неад'емнай часткай грамадскага жыцця і ўяўляюць сабой ўсвядомленае сутыкненне супрацьлегла скіраваных патрэбаў, інтарэсаў, жаданняў двух або некалькіх сацыяльных суб'ектаў (індывідаў, груп, супольнасцей, дзяржаў і інш.). Нягледзячы на той факт, што сацыяльныя канфлікты ўвесь час суправаджаюць людзей у іх паўсядзённым жыцці, звычайна гэтая з'ява ўспрымаецца як выключна нешта негатыўнае і варожае. Нажаль, далёка не ўсе усведамляюць, што канфлікты бываюць не толькі гвалтоўнымі, але і мірнымі. У дадатак да таго, сацыяльна-палітычныя канфлікты могуць быць не толькі міжгрупавымі ці міжнацыянальнымі, але і ўнутрыгрупавымі, і нават унутрыасобаснымі. Няведанне прыроды і сутнасці сацыяльнага канфлікту ў іх гістарычнай абумоўленасці могуць прывесці да ўзнікнення ў пэўнага індывіда складанасцей з вырашэннем канфліктаў у сучаснасці. Таму з мэтай садзейнічання далейшаму прафесійнаму росту будучых выпускнікоў магістратуры спецыяльнасці «Гісторыя», пашырэнню іх поглядаў і ведаў па гісторыі Беларусі прадугледжана выкладанне на другой ступені атрымання адукацыі вучэбнай дысцыпліны «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі».

**Мэтай вучэбнай дысцыпліны** «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі» з'яўляецца вывучэнне сутнасці сацыяльна-палітычных канфліктаў і спецыфікі іх распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

ахарактарызаваць прыроду і сутнасць канфліктаў у грамадстве;

прааналізаваць прычыны ўзнікнення сацыяльна-палітычных канфліктаў і спосабы іх вырашэння;

вызначыць агульнасць і адметнасць тыпалогіі канфліктаў у беларускім грамадстве ў сярэднявеччы, новы і навейшы час.

Вучэбная дысцыпліна «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі» з'яўляецца кампанентам установы вышэйшай адукацыі, адносіцца да модуля «Традыцыі і наватыі ў вывучэнні гісторыі Беларусі». Месца дадзенай дысцыпліны ў навучальным працэсе вызначаецца, зыходзячы з адпаведнасці іншым дысцыплінам, якія выкладаюцца на гістарычным факультэце.

Дысцыпліна «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі» мае сувязь з дысцыплінамі «Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX - пачатак XXI стст.)» і «Сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння айчыннай і ўсеагульнай гісторыі».

**Патрабаванні да кампетэнцый**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі » павінна забяспечыць фарміраванне наступных паглыбленых прафесійных і спецыялізаваных кампетэнцый:

**паглыбленыя прафесійныя** кампетэнцыі:

ППК–2 Быць здольным сістэматызаваць і класіфікаваць сацыяльныя і этнакультурныя працэсы, тлумачыць іх уплыў на гістарычнае развіццё грамадства.

**спецыялізаваныя** кампетэнцыі:

СК–2 Быць здольным ацэньваць змест і механізмы найважнейшых сацыяльна-эканамічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў гістарычнай рэтраспектыве

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

дынаміку і формы ўдзелу розных груп насельніцтва Беларусі ў грамадска-палітычных працэсах;

ролю сацыяльна-палітычных канфліктаў у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі;

агульныя і адметныя рысы тыпаў сацыяльна-палітычных канфліктаў на тэрыторыі Беларусі на розных этапах яе развіцця;

спосабы вырашэння канфліктаў у залежнасці ад асаблівасцей іх віду і тыпу;

**умець:**

праводзіць пошук, класіфікацыю, сістэматызацыю і крытыку гістарыяграфіі і крыніц па гісторыі сацыяльных канфліктаў у Беларусі;

вызначаць тыпы і віды сацыяльных канфліктаў на ўсіх этапах гістарычнага развіцця Беларусі;

выяўляць і аналізаваць прычыны і наступствы сацыяльнага пратэсту на тэрыторыі Беларусі ў сярэднявеччы, новы і навейшы час;

**валодаць:**

навыкамі падбору, аналізу і сістэматызацыі інфармацыі па гісторыі сацыяльных канфліктаў на тэрыторыі Беларусі;

навыкамі падрыхтоўкі аналітычных матэрыялаў для абгрунтавання варыянтаў магчымых наступстваў прыняцця кіруючых рашэнняў з апорай на гістарычны вопыт.

Дысцыпліна вывучаецца ў I семестры. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі» адведзена 90 гадзін, з іх: 36 аўдыторных гадзін (16 – лекцыі, 20 – семінарскія заняткі). Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 залікoвыя адзінкі.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залік у 1 семестры.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Тэма 1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну. Крыніцы і гістарыяграфія.**

Актуальнасць тэмы. Мэта і задачы курса, яго асноўная праблематыка. Характарыстыка паняцця «сацыяльна-палітычны канфлікт». Прырода і сутнасць сацыяльна-палітычных канфліктаў у грамадстве. Погляды на прыроду сацыяльна-палітычных канфліктаў прадстаўнікоў розных навуковых кірункаў Э. Дзюркгейм, М. Вэбер, Т. Парсанс; Г. Зімель, К. Маркс, Р. Дарэндорф, Л. Козер. Асноўныя тыпы і характарыстыкі канфліктаў. Этапы ўзнікнення і развіцця сацыяльнага і палітычнага канфлікту. Спосабы вырашэння канфліктаў. Віды крыніц: дакументальныя, наратыўныя і эпісталярныя. Стан распрацоўкі праблемы ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

**Тэма 2. Спецыфіка сацыяльнага канфлікту ў Сярэднявеччы.**

Сацыяльныя адносіны ў сярэднявечным грамадстве. Агульнаеўрапейскія тэндэнцыі і асаблівасці на землях Беларусі. Маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя. Афармленне княжацкай улады і ўзнікненне першых дзяржаў. Удзельная (феадальная) раздробленасць. “Зямля” як сацыяльна-палітычны феномен. Сацыяльныя працэсы ва ўсходніх славян і балтаў у XII–XIII стст. Праблема зараджэння дзяржавы на літоўскіх землях. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага і адлюстраванне сацыяльных супярэчнасцей у балтаў і славян.

**Тэма 3. Развіццё феадальных адносін і міжсаслоўныя супярэчнасці ў ВКЛ.**

Афармленне сацыяльнай структуры грамадства ў XIV–XVI стст.: шляхта, мяшчане, сяляне. Духавенства як асаблівая сацыяльная група. Фарміраванне і «закрыццё» шляхецкага саслоўя. Сацыяльныя супярэчнасці паміж шляхтай і мяшчанствам. Працэс запрыгоньвання і сацыяльны пратэст беларускага сялянства. Прыватны канфлікт як адлюстраванне сацыяльных адносін на беларускіх землях.

**Тэма 4. Сацыяльныя канфлікты перыяду высокага Сярэднявечча і ранняга Новага часу.**

Дынастычная барацьба ў ВКЛ 1377–1392 гг. Грамадзянская вайна 1430-х гг. Мяцеж М. Глінскага 1508 г. Канфедэрацыі і Рокашы. Сацыяльны змест казацка-сялянскай (антыфеадальнай) вайны 1648–1651 гг. Сялянскі і мяшчанскі рух у Беларусі ў час вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. Грамадзянская вайна 1696–1700 гг. Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гг. Барская канфедэрацыя: змест, сацыяльны склад, вынікі. Барацьба за рэформы і паўстанне 1794 г.: сацыяльны аспект.

**Тэма 5. Рэлігійныя канфлікты ў гісторыі Беларусі ў XIV–XVIII ст.**

Асаблівасці міжканфесійных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім: язычніцтва–праваслаўе–каталіцызм. Стасункі з яўрэйскім насельніцтвам. Канфесійны фактар у грамадзянскіх канфліктах канца XIV – пачатку XVI ст. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 г. як сацыяльны канфлікт: ад палемікі да

гвалту. Абвастрэнне сацыяльна-канфесійных супярэчнасцей у сярэдзіне XVII ст. Адыход ад прынцыпу талерантнасці і “праблема дысідэнтаў.

**Тэма 6. Сацыяльныя канфлікты ў сялянскім асяроддзі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.**

Асаблівасці сялянскай барацьбы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Эвалюцыя форм і характару сялянскага руху. Імкненне прыгоннага сялянства да вызвалення ад феадальнай залежнасці ў першай палове XIX ст. Барацьба дзяржаўных сялян супраць феадальнага прыгнёту. Рух цвярозасці напярэдадні адмены прыгоннага права. Хваля сялянскага пратэсту пасля скасавання прыгоннага права. Абвастрэнне зямельнага пытання і змена адносін беларускага сялянства да зямлі і працы: агульнае і асаблівае. Сервітутны рух. Антыўрадавыя выступленні ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайны. Месца ўнутрысаслоўных канфліктаў у сялянскім асяроддзі.

**Тэма 7. Канфесійны фактар пры сацыяльных узрушэннях XIX ст.**

Урадавая палітыка ў адносінах да каталіцкага і уніяцкага насельніцтва ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Рэакцыя вернікаў на змены ў адносінах з боку ўладаў да неправаслаўнага насельніцтва. Выступленні уніятаў супраць далучэння іх да праваслаўнай царквы ў 1800–1830-х гг. Сацыяльна-саслоўны склад супраціўнікаў дэўнізацыі. Рашэнні Полацкага сабора 1839 г. і рэакцыя на іх з боку насельніцтва беларускіх губерняў і сусветнай супольнасці. Канфесійнае размежаванне падчас паўстанняў 1830–1831 гг. Касцёльныя дэмаршы на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 1860-х гг. Расстаноўка сіл па канфесійнай прыкмеце падчас паўстання 1863–1864 гг. Змены ва ўрадавай палітыцы пасля падаўлення паўстанняў XIX ст. і рэакцыя на яе вернікаў. Міжканфесійныя зносіны на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Яўрэйскія пагромы у беларускіх гарадах у пачатку XX ст. Канфесійны фактар у гады Першай сусветнай вайны.

**Тэма 8. Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**

Формы, дынаміка і характар сацыяльнага пратэсту наёмных работнікаў. Распаўсюджванне марксізму. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП). Польская сацыялістычная партыя (ППС). Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд). «Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі». I з’езд РСДРП. Стварэнне Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі. Рабочы рух, з’яўленне палітычных партый і арганізацый. Паліцэйскі сацыялізм. Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Польскай сацыялістычнай партыі на Літве. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і ўздым выступленняў рабочых падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. Дынаміка і характар рабочага руху пасля паражэння Першай расійскай рэвалюцыі. Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі падчас рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г.

**Тэма 9. Сацыяльна-палітычныя канфлікты на тэрыторыі Беларусі ў 1920–1930-я гг.**

Усталяванне савецкай улады і рэакцыя беларускага насельніцтва на бальшавіцкія пераўтварэнні. Канфесійная палітыка савецкага ўрада і рэакцыя на яе з боку вернікаў БССР. Нацыянальная палітыка РКП(б) і КП(б) Беларусі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР. Палітыка «беларусізацыі» як праява негвалтоўнага сацыяльнага канфлікту ў БССР у 1920-я гг. Паварот у грамадска-палітычным і культурным жыцці ў пачатку 1930-х гг. Разгортванне ідэйна-палітычнай барацьбы з беларускім «нацыянал-дэмакратызмам». Курс на сацыялістычную перабудову вёскі. Ажыццяўленне «палітыкі раскулачвання». Сацыяльны пратэст сельскага насельніцтва. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Стварэнне і дзейнасць Беларускага пасольскага клуба. Дзейнасць партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Партызанскі рух. Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС). Дзейнасць польскіх, яўрэйскіх і іншых партый і арганізацый. Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ). Стварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне». Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. Косаўскае (1927) і Асташынскае (1932) выступленні сялян, Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян (1933), выступленні нарачанскіх рыбакоў (1935). Спробы стварэння дэмакратычнага антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб’яднанне (БНА).

**Тэма 10. Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.**

Узброены супраціў уладам БССР у 1944–1945 гг. Падпольныя антысавецкія арганізацыі моладзі ў Беларусі. Дзейнасць Арміі Краёвай і АУН– УПП у заходніх абласцях БССР і іх ліквідацыя. Дзейнасць падпольных антысавецкіх арганізацый у пасляваенныя гады. Рэакцыя на саветызацыю з боку жыхароў заходнебеларускіх зямель у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Антыкамуністычны рух у БССР у сярэдзіне 1950-х – 1980-я гг. Нонканфармізм. Антыўрадавы супраціў канфесійнага характару. Агульнадэмакратычная плынь. Партыя свабоды рускага народа. Рух нацыянальных меншасцей. Фарміраванне нефармальных асяродкаў у Мінску ў 1950–1970-я гг. Дысідэнцтва. Індывідуальны супраціў. Дэмакратызацыя грамадства падчас палітыкі «перабудовы». Галоснасць. Нацыянальна-патрыятычны рух у 1980-х гг. Узнікненне нефармальных аб’яднанняў «Талака», «Паходня», «Узгор’е» і інш.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
**“Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі” (дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа студэнтаў | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагляднія, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | колькасць гадзін КСР | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | **Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну. Крыніцы і гістарыяграфія.**<br>1. Актуальнасць тэмы. Мэта і задачы курса.<br>2. Характарыстыка паняцця «сацыяльна-палітычны канфлікт».<br>3. Прырода і сутнасць сацыяльна-палітычных канфліктаў у грамадстве.<br>4. Погляды на прыроду сацыяльна-палітычных канфліктаў прадстаўнікоў розных навуковых кірункаў .<br>5. Асноўныя тыпы і характарыстыкі канфліктаў.<br>6. Этапы ўзнікнення і развіцця сацыяльнага і палітычнага канфлікту. Спосабы вырашэння канфліктаў.<br>7. Віды крыніц: дакументальныя, наратыўныя і эпісталярныя. | 2 | 2 | | 2 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | [1,2,3] | Вуснае апытанне |
| 2 | **Спецыфіка сацыяльнага канфлікту ў Сярэднявеччы.**<br>1. Сацыяльныя адносіны ў сярэднявечным грамадстве. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | [1,2,3] | Канспект, рэферат |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Удзельная (феадальная) раздробленасць.<br>3. “Зямля” як сацыяльна-палітычны феномен. 4. Сацыяльныя працэсы ва ўсходніх славян і балтаў у XII–XIII стст. Праблема зараджэння дзяржавы на літоўскіх землях.<br>5. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага і адлюстраванне сацыяльных супярэчнасцей у балтаў і славян. | | | | | | | |
| 3 | **Развіццё феадальных адносін і міжсаслоўныя супярэчнасці ў ВКЛ.**<br>1. Афармленне сацыяльнай структуры грамадства ў XIV–XVI стст.: шляхта, мяшчане, сяляне.<br>2. Духавенства як асаблівая сацыяльная група. 3. Фарміраванне і «закрыццё» шляхецкага саслоўя. Сацыяльныя супярэчнасці паміж шляхтай і мяшчанствам.<br>4. Працэс запрыгоньвання і сацыяльны пратэст беларускага сялянства. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | 1,2,3 | Канспект, рэферат |
| 4 | **Сацыяльныя канфлікты перыяду высокага Сярэднявечча і ранняга Новага часу.**<br>1. Дынастычная барацьба ў ВКЛ 1377–1392 гг. 2. Грамадзянская вайна 1430-х гг.<br>4. Мяцеж М. Глінскага 1508 г. Канфедэрацыі і Рокашы.<br>5. Сацыяльны змест казацка-сялянскай (антыфеадальнай) вайны 1648–1651 гг.<br>6. Сялянскі і мяшчанскі рух у Беларусі ў час вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. 7. Грамадзянская вайна 1696–1700 гг.<br>8. Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гг.<br>9. Барацьба за рэформы і паўстанне 1794 г.: сацыяльны аспект. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | [1,2,3 | Вуснае апытанне |
| 5 | **Рэлігійныя канфлікты ў гісторыі Беларусі ў XIV–XVIII ст.** | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | [1,2,3] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Асаблівасці міжканфесійных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім.<br>2. Канфесійны фактар у грамадзянскіх канфліктах канца XIV – пачатку XVI ст.<br>3. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 г. як сацыяльны канфлікт: ад палемікі да гвалту.<br>4. Абвастрэнне сацыяльна-канфесійных супярэчнасцей у сярэдзіне XVII ст. Адыход ад прынцыпу талерантнасці і “праблема дысідэнтаў. | | | | | | | |
| 6 | **Сацыяльныя канфлікты ў сялянскім асяроддзі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.**<br>1. Асаблівасці сялянскай барацьбы ў канцы XVIII – пачатку XX ст<br>2. Абвастрэнне зямельнага пытання і змена адносін беларускага сялянства да зямлі і працы. Сервітутны рух.<br>3. Антыўрадавыя выступленні ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайны.<br>4. Месца ўнутрысаслоўных канфліктаў у сялянскім асяроддзі. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | 1,2,3 | Вуснае апытанне |
| 7 | **Канфесійны фактар пры сацыяльных узрушэннях XIX ст.**<br>1. Урадавая палітыка ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.<br>2. Канфесійнае размежаванне падчас паўстанняў 1830–1831 гг.<br>3. Міжканфесійныя зносіны на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.<br>4. Канфесійны фактар у гады Першай сусветнай вайны. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | 1,2,3 | Канспект, рэферат |
| 8 | **Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**<br>1. Распаўсюджванне марксізму.<br>2. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. | 2 | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі. Прэзентацыя | 1,2,3 | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд).<br>4. I з'езд РСДРП.<br>5. Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі.<br>6..Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады.<br>7. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і ўздым выступленняў рабочых падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг.<br>8. Дынаміка і характар рабочага руху пасля паражэння Першай расійскай рэвалюцыі.<br>9. Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі падчас рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г. | | | | | | | |
| 9 | **Сацыяльна-палітычныя канфлікты на тэрыторыі Беларусі ў 1920–1930-я гг.**<br>1. Усталяванне савецкай улады і рэакцыя беларускага насельніцтва на бальшавіцкія пераўтварэнні.<br>2. Канфесійная палітыка савецкага ўрада і рэакцыя на яе з боку вернікаў БССР.<br>3. Нацыянальная палітыка РКП(б) і КП(б) Беларусі.<br>4. Палітыка «беларусізацыі».<br>5. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.<br>6. Партызанскі рух.<br>7. Дзейнасць польскіх, яўрэйскіх і іншых партый і арганізацый.<br>8. Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ).<br>9. Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ). Стварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне».<br>10. Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. ).<br>11. Спробы стварэння дэмакратычнага | | 2 | | 12 | Метадычныя дапаможнікі. | 1,2,3 | Справаздача па выкананым у рамках самастойнай працы індывідуальным заданнях |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). | | | | | | | |
| 10 | **Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.**<br>1. Узброены супраціў уладам БССР у 1944–1945 гг.<br>2. Антыкамуністычны рух у БССР у сярэдзіне 1950-х – 1980-я гг.<br>3. Фарміраванне нефармальных асяродкаў у Мінску ў 1950–1970-я гг. Дысідэнцтва. Індывідуальны супраціў.<br>4. Дэмакратызацыя грамадства падчас палітыкі «перабудовы». | | 2 | | 12 | Метадычныя дапаможнікі. | [1,2,3 | Справаздача па выкананым у рамках самастойнай працы індывідуальным заданнях |

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі”**

| № п/п | Назва тэмы | Кол-касць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну. Крыніцы і гістарыяграфія. | 2 | Актуальнасць тэмы. Мэта і задачы курса, яго асноўная праблематыка. Характарыстыка паняцця «сацыяльна-палітычны канфлікт». Прырода і сутнасць сацыяльна-палітычных канфліктаў у грамадстве. Погляды на прыроду сацыяльна-палітычных канфліктаў прадстаўнікоў розных навуковых кірункаў Э. Дзюркгейм, М. Вэбер, Т. Парсанс; Г. Зімель, К. Маркс, Р. Дарэндорф, Л. Козер. Асноўныя тыпы і характарыстыкі канфліктаў. Этапы ўзнікнення і развіцця сацыяльнага і палітычнага канфлікту. Спосабы вырашэння канфліктаў. Віды крыніц: дакументальныя, наратыўныя і эпісталярныя. Стан распрацоўкі праблемы ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 2 | Спецыфіка сацыяльнага канфлікту ў Сярэднявеччы. | 4 | Сацыяльныя адносіны ў сярэднявечным грамадстве. Агульнаеўрапейскія тэндэнцыі і асаблівасці на землях Беларусі. Маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя. Афармленне княжацкай улады і ўзнікненне першых дзяржаў. Удзельная (феадальная) раздробленасць. “Зямля” як сацыяльна-палітычны феномен. Сацыяльныя працэсы ва ўсходніх славян і балтаў у XII–XIII стст. Праблема зараджэння дзяржавы на літоўскіх землях. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага і адлюстраванне сацыяльных супярэчнасцей у балтаў і славян. | Справаздача аб выкананні індывідуальга задання |
| 3 | Развіццё феадальных адносін і міжсаслоўныя супярэчнасці ў ВКЛ. | 4 | Афармленне сацыяльнай структуры грамадства ў XIV–XVI стст.: шляхта, мяшчане, сяляне. Духавенства як асаблівая сацыяльная група. Фарміраванне і «закрыццё» шляхецкага саслоўя. Сацыяльныя супярэчнасці паміж шляхтай і мяшчанствам. Працэс запрыгоньвання і сацыяльны пратэст беларускага сялянства. Прыватны канфлікт як адлюстраванне сацыяльных адносін на беларускіх землях | Прэзентацыі. рэфераты |
| 4 | Сацыяльныя канфлікты перыяду высокага Сярэднявечча і ранняга Новага часу. | 4 | Дынастычная барацьба ў ВКЛ 1377–1392 гг. Грамадзянская вайна 1430-х гг. Мяцеж М. Глінскага 1508 г. Канфедэрацыі і Рокашы. Сацыяльны змест казацка-сялянскай (антыфеадальнай) вайны 1648–1651 гг. Сялянскі і мяшчанскі рух у Беларусі ў час вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. Грамадзянская вайна 1696–1700 гг. Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гг. Барская канфедэрацыя: змест, сацыяльны склад, вынікі. Барацьба за рэформы і паўстанне 1794 г.: сацыяльны | Прэзентацыі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | аспект. | |
| 5 | Рэлігійныя канфлікты ў гісторыі Беларусі ў XIV–XVIII ст. | 4 | Асаблівасці міжканфесійных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім: язычніцтва–праваслаўе–каталіцызм. Стасункі з яўрэйскім насельніцтвам. Канфесійны фактар у грамадзянскіх канфліктах канца XIV – пачатку XVI ст. Берасцейская царкоўная унія 1596 г. як сацыяльны канфлікт: ад палемікі да гвалту. Абвастрэнне сацыяльна-канфесійных супярэчнасцей у сярэдзіне XVII ст. Адыход ад прынцыпу талерантнасці і “праблема дысідэнтаў. | Праца з крыніцамі. |
| 6 | Сацыяльныя канфлікты ў сялянскім асяроддзі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. | 4 | Асаблівасці сялянскай барацьбы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Эвалюцыя форм і характару сялянскага руху. Імкненне прыгоннага сялянства да вызвалення ад феадальнай залежнасці ў першай палове XIX ст. Барацьба дзяржаўных сялян супраць феадальнага прыгнёту. Рух цвярозасці напярэдадні адмены прыгоннага права. Хваля сялянскага пратэсту пасля скасавання прыгоннага права. Абвастрэнне зямельнага пытання і змена адносін беларускага сялянства да зямлі і працы: агульнае і асаблівае. Сервітутны рух. Антыўрадавыя выступленні ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайны. Месца ўнутрысаслоўных канфліктаў у сялянскім асяроддзі. | Гутарка, праверка выкананых заданняў. |
| 7 | Канфесійны фактар пры сацыяльных узрушэннях XIX ст. | 4 | Урадавая палітыка ў адносінах да каталіцкага і ўніяцкага насельніцтва ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Рэакцыя вернікаў на змены ў адносінах з боку ўладаў да неправаслаўнага насельніцтва. Выступленні ўніятаў супраць далучэння іх да праваслаўнай царквы ў 1800–1830-х гг. Сацыяльна-саслоўны склад супраціўнікаў дэўнізацыі. Рашэнні Полацкага сабора 1839 г. і рэакцыя на іх з боку насельніцтва беларускіх губерняў і сусветнай супольнасці. Канфесійнае размежаванне падчас паўстанняў 1830–1831 гг. Касцёльныя дэмаршы на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 1860-х гг. Расстаноўка сіл па канфесійнай прыкмеце падчас паўстання 1863–1864 гг. Змены ва ўрадавай палітыцы пасля падаўлення паўстанняў XIX ст. і рэакцыя на яе вернікаў. Міжканфесійныя зносіны на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Яўрэйскія пагромы у беларускіх гарадах у пачатку XX ст. Канфесійны фактар у гады Першай сусветнай вайны. | Справаздача аб выкананні індывідуальга задання |
| 8 | Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | 4 | Формы, дынаміка і характар сацыяльнага пратэсту наёмных работнікаў. Распаўсюджванне марксізму. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд). «Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі». I з’езд РСДРП. Стварэнне Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі. Рабочы рух, з’яўленне палітычных партый і арганізацый. Паліцэйскі сацыялізм. ..Рабочы рух на тэрыторыі Беларусі падчас рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г. | Прэзентацыі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9 | Сацыяльна-палітычныя канфлікты на тэрыторыі Беларусі ў 1920–1930-я гг. | 12 | Усталяванне савецкай улады і рэакцыя беларускага насельніцтва на бальшавіцкія пераўтварэнні. Канфесійная палітыка савецкага ўрада і рэакцыя на яе з боку вернікаў БССР. Нацыянальная палітыка РКП(б) і КП(б) Беларусі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР. Палітыка «беларусізацыі» як праява негвалтоўнага сацыяльнага канфлікту ў БССР у 1920-я гг. Паварот у грамадска-палітычным і культурным жыцці ў пачатку 1930-х гг. Разгортванне ідэйна-палітычнай барацьбы з беларускім «нацыянал-дэмакратызмам». Курс на сацыялістычную перабудову вёскі. Ажыццяўленне «палітыкі раскулачвання». Сацыяльны пратэст сельскага насельніцтва. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Стварэнне і дзейнасць Беларускага пасольскага клуба. Дзейнасць партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Партызанскі рух. Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС). Дзейнасць польскіх, яўрэйскіх і іншых партый і арганізацый. Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ). Стварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне». Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. Косаўскае (1927) і Асташынскае (1932) выступленні сялян, Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян (1933), выступленні нарачанскіх рыбакоў (1935). Спробы стварэння дэмакратычнага антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). | Справаздача аб выкананні індывідуальга задання |
| 10 | Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг. | 12 | Узброены супраціў уладам БССР у 1944–1945 гг. Падпольныя антысавецкія арганізацыі моладзі ў Беларусі. Дзейнасць Арміі Краёвай і АУН– УПП у заходніх абласцях БССР і іх ліквідацыя. Дзейнасць падпольных антысавецкіх арганізацый у пасляваенныя гады. Рэакцыя на саветызацыю з боку жыхароў заходнебеларускіх зямель у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Антыкамуністычны рух у БССР у сярэдзіне 1950-х – 1980-я гг. Нонканфармізм. Антыўрадавы супраціў канфесійнага характару. Агульнадэмакратычная плынь. Партыя свабоды рускага народа. Рух нацыянальных меншасцей. Фарміраванне нефармальных асяродкаў у Мінску ў 1950–1970-я гг. Дысідэнцтва. Індывідуальны супраціў. Дэмакратызацыя грамадства падчас палітыкі «перабудовы». Галоснасць. Нацыянальна-патрыятычны рух у 1980-х гг. Узнікненне нефармальных аб'яднанняў «Талака», «Паходня», «Узгор'е» і інш. | Справаздача аб выкананні індывідуальга задання |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 573 с.
2. Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : вучэб.-метад. дапам. / А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2017. – 320 с.
3. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 335 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944–1956 : даведнік / пад рэд. А. І. Дзярновіча [і інш.]. – Мінск : Арх. Найноўшае Гісторыі, 1999. – 190 с.
2. Бабосов, Е. М. Конфликтология / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2000. – 464 с.
3. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах : пер. з пол. М. Раманоўскага, А. Істоміна. – Мінск : Беларус. гіст. агляд, 2002. – 459 с.
4. Бич, М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. / М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1983. – 278 с.
5. Буховец, О. Г. Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века: новые материалы, методы, результаты / О. Г. Буховец. – М. : Мосгорархив, 1996. – 398 с.
6. Гарбачова, В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі / В. В. Гарбачова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2001. – 186 с.
7. Гісторыя сялянства Беларусі. Са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. / Я. К. Анішчанка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2002. – 3т.
8. Дзярновіч, А. І. Дэмакратычная апазіцыя Беларусі, 1956–1991: персанажы і кантэкст : даведнік / пад рэд. А. І. Дзярновіча. – Мінск : Арх. Найноўшае Гісторыі, 1999. – 181 с.
9. Емельянчык, У. П. Паланез для касінераў: (з падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі) / У. П. Емельянчык. – Мінск : Беларусь, 1994. – 160 с.
10. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – 496 с.
11. Марозава, С. В. Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у беларускай гістарыяграфіі / С. В. Марозава. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2002. – 132 с.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы: пошук (падбор) і агляд літаратуры і электронных крыніц па індывідуальна вызначанай праблеме дысцыпліны; выкананне хатняга задання (праекта); працы, якія прадугледжваюць вырашэнне канкрэтных сітуацый; вывучэнне матэрыялу, вынесенага на самастойную

прапрацоўку; падрыхтоўка эсэ і прэзентацый на зададзеныя тэмы.

У якасці прыкладнага задання для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў і ажыццяўлення пазааўдыторнай самастойнай работы прадугледжана падрыхтоўка і абарона творчых заданняў па тэме «Сацыяльна-палітычныя канфлікты на тэрыторыі Беларусі “. Мэта задання: выкарыстоўваючы тэорыю канфліктаў прасачыць асноўныя стадыі і наступствы разгортвання найбольш значных сацыяльна-палітычных пратэстаў у беларускім грамадстве ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: паўстанняў 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг.; рэвалюцыі 1905–1907 гг., Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 гг.

## Патрабаванні да афармлення і зместу індывідуальнага задання

Праца друкуецца з выкарыстаннем камп’ютара і прынтара на адным баку аркуша белай паперы фармату А4 (210х297 мм). Набор тэксту ажыццяўляецца з дапамогай тэкставага рэдактара Microsoft Word. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфты тыпа Times New Roman памерам 14 пунктаў, міжрадковы інтэрвал – 1,5 радка. Усталёўваюцца наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм. Усе старонкі (за выключэннем тытульнага ліста) павінны быць пранумараваны. Індывідуальнае пісьмовае заданне павінна ўтрымліваць тытульны ліст, асноўную частку і спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры; таксама дапускаецца ўвядзенне такіх раздзелаў, як змест, уводзіны і заключэнне. Аб’ём працы павінен быць не менш за 8 старонак без уліку тытульнага ліста і спісу выкарыстанай літаратуры.

## Тэмы рэфератыўных работ

1. Эвалюцыя падыходаў у вывучэнні сацыяльных канфліктаў.
2. Балцка-славянскія супярэчнасці ў сярэднявечны перыяд.
3. Сацыяльныя супярэчнасці паміж шляхтай і мяшчанствам.
4. Унутрыпалітычныя канфлікты ў ВКЛ у XIV–XV стст.
5. Сялянскі рух на беларускіх землях у XVIII ст.
6. Выступленні гараджан на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст.
7. Рух цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.
8. Унутрысаслоўныя сялянскія канфлікты на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
9. Касцёльныя дэмаршы на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 1860-х гг.
10. Яўрэйскія пагромы у беларускіх гарадах у пачатку XX ст.
11. Нацыянальны фактар у рабочым руху на тэрыторыі Беларусі на мяжы XIX–XX ст.
12. Лакальныя сацыяльныя канфлікты ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг.
13. Шляхі вырашэння сацыяльных канфліктаў у БССР у другой палове 40-х гг. XX ст.
14. Праявы нонканфармізму ў Савецкай Беларусі ў сярэдзіне 50-х – 80-я гг. XX ст.

## Патрабаванні да афармлення і зместу рэферата.

Рэферат друкуецца з выкарыстаннем камп’ютара і прынтара на адным баку аркуша белай паперы фармату А4 (210x297 мм). Набор тэксту ажыццяўляецца з дапамогай тэкставага рэдактара Microsoft Word. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфты тыпа Times New Roman памерам 14 пунктаў, міжрадковы інтэрвал – 1,5 радка. Усталёўваюцца наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм. Усе старонкі (за выключэннем тытульнага ліста) павінны быць пранумараваны. Рэферат павінен утрымліваць тытульны ліст, асноўную частку і спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры; таксама дапускаецца ўвядзенне такіх раздзелаў, як змест, уводзіны і заключэнне. Аб’ём рэферата павінен быць не менш за 8 старонак без уліку тытульнага ліста і спісу выкарыстанай літаратуры.

## Прыкладны пералік пытанняў да заліку

1. Сутнасць сацыяльнага канфлікту, яго тыпы і асноўныя характарыстыкі. Стадыі развіцця канфліктаў і спосабы іх вырашэння.

2. Сацыяльны канфлікт у Сярэднявеччы і ранні Новы час: досвед сусветнай і беларускай гістарыяграфіі.

3. Спецыфіка сацыяльнага канфлікту ў сярэднявечнай Беларусі: князь і «зямля» (X–XIII стст.).

4. Сацыяльныя аспекты барацьбы за вярхоўную ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV–пачатку XVI ст.

5. .Станаўленне саслоўнай структуры беларускага грамадства і міжсаслоўныя супярэчнасці: шляхта – мяшчане – сяляне.

6. Рэлігійныя канфлікты ў гісторыі Беларусі (XV–XVIII стст.).

7. Войны і сацыяльныя канфлікты ў Беларусі ў сярэдзіне XVII–першай палове XVIII ст.

8. Спробы сацыяльных пераўтварэнняў у Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII ст.

9. Сялянскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст.

10. Сацыяльныя канфлікты ў сялянскім асяроддзі Беларусі ў першай палове XIX.

11. Сацыяльныя канфлікты ў сялянскім асяроддзі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

12. Пратэст працоўнага класу на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

13. Канфесійны фактар пры сацыяльных узрушэннях на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст.

14. Канфесійны фактар пры сацыяльных узрушэннях на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст.

15. Сацыяльныя канфлікты ў Беларусі ў міжваенны перыяд.

16. Сацыяльныя канфлікты ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-х гг.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі і методыка фарміравання выніковай адзнакі

Асноўным сродкам дыягностыкі засваення ведаў і авалодання неабходнымі ўменнямі і навыкамі па вучэбнай дысцыпліне «Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі» з'яўляецца праверка заданняў разнастайнага тыпу, што выконваюцца ў рамках гадзін, якія адводзяцца на семінарскія заняткі і самастойную работу студэнтаў.

Для дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў выкарыстоўваюцца вусная, пісьмовая, вусна-пісьмовая і тэхнічная формы. Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца: індывідуальныя кансультацыі, сумоўі, даклады на семінарскіх занятках, ацэньванне на аснове дзелавой гульні, тэсты і інш. Да пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца тэсты, кантрольныя апытанні, эсэ, рэфераты, ацэнка на аснове праектнага метаду і інш. Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца: справаздачы па аўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай, залік, ацэнка на аснове дзелавой гульні і інш. Да тэхнічнай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца: выкананне заданняў, у тым ліку і адкрытага (эўрыстычнага) тыпу на адукацыйным партале eduhist.bsu.by, электронныя тэсты і практыкумы, падрыхтоўка камп'ютарных прэзентацый і інш.

Адзнака за семінар уключае:

- адказ (паўната адказу) – 70%;
- пастаноўку пытанняў – 20%;
- ацэнка работы на семінары (групы, індывідуальна) – 10%.

Рэфераты выкарыстоўваюцца для абагульнення і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу. У працэсе падрыхтоўкі рэферата студэнт мабілізуе і актуалізуе існуючыя ўменні, самастойна набывае новыя веды, неабходныя для раскрыцця тэмы, супастаўляючы розныя пазіцыі і пункту гледжання.

Пры ацэньванні рэферата ўвага звяртаецца на:

- змест і паслядоўнасць выкладання – 35%;
- адпаведнасць і паўнату раскрыцця тэмы – 20%;
- самастойнасць меркаванняў – 35%;
- афармленне – 10%.

Эсэ з'яўляюцца сродкам, які дазваляе ацаніць уменне студэнта пісьмова выкладаць сутнасць пастаўленай праблемы, самастойна праводзіць аналіз гэтай праблемы з выкарыстаннем канцэпцый і аналітычнага інструментара дысцыпліны, рабіць высновы, якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пастаўленай праблеме.

Пры ацэньванні эсэ адзнака фарміруецца наступным чынам:

- змест і структура выкладання – 25 %;
- самастойнасць меркаванняў – 30 %;
- афармленне – 10 %;
- аўдыторнае выступленне з эсэ, абарона аўтарскай пазіцыі – 35 %.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне “**Сацыяльна-палітычныя канфлікты ў гісторыі Беларусі** з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з вызначэннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX - пачатак XXI стст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Пратакол № 10 ад 29.04.2020 |
| Сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння айчыннай і ўсеагульнай гісторыі | Усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання<br><br>Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Пратакол №12 ад 31.05.2019<br><br>Пратакол №11 ад 28.05.2019 |

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

ВЫПИСКА ИЗ ПРОТОКОЛА

29. 04. 2020. г. Минск № 10

кафедры истории Беларуси
и славянских народов

Председатель – С.А.Толмачёва
Секретарь – А.А.Вереник
Присутствовали: Барабаш Н.В., Великий А.Ф., Груцо И.А., Житко А.П., Жмуровский С.Д., Касович А.В., Коваленя А.А., Канапацкая З.И., Кадира В.Н., Лютая А.Э., Приступа Н.Н., Ратько А.Ф., Соколов М.Н., Трубчик П.А., Цобкало А.А.

СЛУШАЛИ:

О рекомендации к утверждению Научно-методическим советом учебной программы для второй ступени получения высшего образования по учебной дисциплине “Социально-политические конфликты в истории Беларуси” для специальности: 1-21 80 15 История.

РЕШИЛИ:

Рекомендовать к утверждению Научно-методическим советом учебную программу для второй ступени получения высшего образования по учебной дисциплине “Социально-политические конфликты в истории Беларуси” для специальности: 1-21 80 15 История

Заведующий кафедрой С.А.Толмачева

Секретарь А.А. Вереник

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

ВЫПИСКА ИЗ ПРОТОКОЛА

29. 04. 2020 г. Минск № 10

кафедры истории Беларуси
и славянских народов

Председатель – С.А.Толмачёва
Секретарь – А.А.Вереник
Присутствовали: Барабаш Н.В., Великий А.Ф., Груцо И.А., Житко А.П., Жмуровский С.Д., Касович А.В., Коваленя А.А., Канапацкая З.И., Кадира В.Н., Лютая А.Э., Приступа Н.Н., Ратько А.Ф., Соколов М.Н., Трубчик П.А., Цобкало А.А.

СЛУШАЛИ:

О рекомендации к утверждению Научно-методическим советом учебной программы для второй ступени получения высшего образования по учебной дисциплине “Социально-политические конфликты в истории Беларуси” для специальности: 1-21 80 15 История.

РЕШИЛИ:

Рекомендовать к утверждению Научно-методическим советом учебную программу для второй ступени получения высшего образования по учебной дисциплине “Социально-политические конфликты в истории Беларуси” для специальности: 1-21 80 15 История

Заведующий кафедрой С.А.Толмачева

Секретарь А.А. Вереник

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

ВЫПИСКА ИЗ ПРОТОКОЛА

16.06.2020 № 5

г. Минск

заседания научно-методического
совета

Председатель – А.В.Маковчик
Секретарь – И.А.Турченко

СЛУШАЛИ: о рекомендации к утверждению учебной программы учреждения высшего образования по учебной дисциплине «Социально-политические конфликты в истории Беларуси» для специальности 1-21 80 15 История.

ПОСТАНОВИЛИ: рекомендовать к утверждению учебную программу учреждения высшего образования по учебной дисциплине «Социально-политические конфликты в истории Беларуси» для специальности 1-21 80 15 История.

Председатель НМС БГПУ А.В.Маковчик

Секретарь НМС БГПУ И.А.Турченко